**Басік К.М.,** студ. гр. 302а БДУКМ
Навук. кір. – Гулак А.А.,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# ГІПОТЭЗЫ ПАХОДЖАННЯ ТАПОНІМА *БРОННАЯ ГАРА*

Даследаванне тапанімікі спрыяе паглыбленню гістарычных і краязнаўчых ведаў. Сёння даказана, што тапонімы – увасабленне культуры, побыту, звычаяў, і лакальных асаблівасцей народнай культуры. Тапонімы з'яўляюцца неад'емнай часткай сучаснай цывілізацыі, яны ўтвараюць своеасаблівае тапанімічнае асяроддзе, у якім стагоддзямі жывуць, выхоўваюцца цэлыя пакаленні людзей. «Пройдуць тысячагоддзі, – піша Г.Я. Рылюк, – зменіцца ўзровень цывілізацыі, зменяцца ўмовы жыцця, палітычныя прылады, але вечнымі спадарожнікамі людзей застануцца геаграфічныя назвы» [8, с. 8].

Вывучэннем тапанімічнай спадчыны Беларусі займаліся многія даследчыкі, сярод якіх трэба адзначыць В.А. Жучкевіча, Г.Я. Рылюка, Л.М. Лыча, В.П. Лемцюгову, І.Я.Яшкіна, Г.П. Пашкова, В.У. Мартынава і інш.

Аб'ектам майго даследавання з'яўляецца назва вёскі *Бронная Гара* Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У працэсе даследавання тэмы мы сутыкнуліся з неабходнасцю падсумаваць гістарычныя звесткі пра населены пункт *Бронная Гара*. Высветлілася, што крыніц, якія сведчаць пра гістарычнае мінулае *Броннай Гары,* няшмат. Да іх адносіцца ўнікальны помнік – летапіс «Аповесць мінулых гадоў», які ўключае спіс «А се имена всем градом Рускым далним и ближним» [5, с. 214] (датуецца прыблізна канцом XIV ст.). У ім узгадваецца месца *Броницарев*. Але выклікае сумненне тое, наколькі гэты тапонім суадносіцца з тапонімам *Бронная Гара* [5, с. 242].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наступная гістарычная звестка датуецца 2 лютым 1562 г. і знаходзіцца ў актавай кнізе Пінскага гарадскога суда за 1560–1564 гг. Запіс пра маёнтак Броннае ў заяве Міхаіла Козінскага «О самовольномъ выжиганіи евреями золы въ его лѣсу» паведамляе, што ў той час на Броннай Гары знаходзілася пушча, якую незаконна выпальвала яўрэйскае насельніцтва для вывазу попелу на свае падводы. [1, с. 11–12]. (Перспектыўным кірункам з'яўляецца вывучэнне генеалогіі князёў Козінскіх. Знаходжанне асобных імёнаў продкаў Міхала Козінскага і апісання іх дзейнасці можа ўказаць на паходжанне тапоніма *Броннае*). Істотная інфармацыя ёсць ў шматтомным выданні «Акты, издаваемые Виленскою коммиссіею для разбора древнихъ актовъ. Акты о евреяхъ. Том № 18» (1901). Зусім мала дадзеных у кнізе «Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Бярозаўскага раёна» (1987).

На польскай карце 1931 г. адзначана, што на тэрыторыі населенага пункта знаходзіцца чыгуначная станцыя і лесапільня [11]. Гэтыя аб'екты захаваліся і дзейнічаюць да гэтага часу. Найбольшую вядомасць у сучаснай інфармацыйнай прасторы *Бронная Гара* мае як месца масавага знішчэння ў 1942–1943 гг. акупацыйнымі ўладамі мірнага ў асноўным яўрэйскага насельніцтва (больш за 50 000 чалавек).

З 25 мая 1945 г. на тэрыторыі *Броннай Горы* быў арганізаваны 46-ы арсенал ракет і хімічных баявых прыпасаў вайсковай часткі № 67878 БССР. На працягу дзесяцігоддзяў вайсковая частка была засакрэчана, уваход на тэрыторыю строга забаронены і г.д. Усё гэта абумовіла малую колькасць даступнай інфармацыі ў адкрытых крыніцах. Існуе ўзгадванне пра вёску прыблізна за 26 кастрычніка 1945 г. у дакладной запісцы ад ўпаўнаважанага ЦК КП (б) Б В.Я. Заварыкіна і начальніка аддзела рэпатрыяцыі Брэсцкага аблвыканкама С.А. Хвашчэўскага сакратару ЦК КП (б) Б В.М. Маліну аб выніках праверкі зборна-перасылачнага пункта № 316 на станцыі *Бронная Гара*. Там гаворыцца, што на тэрыторыі чыгуначнай станцыі *Бронная Гара*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзейнічае зборна-перасылачны пункт № 316 савецкіх войскаў, з якога ваеннапалонных этапуюць у эвакуацыю. (Падобныя зборна-перасылачныя пункты існавалі ў Брэсце, Высока-Літоўску, Пружанах, Ваўкавыску і Гродна) [6, с. 448–449].

Лінвістычных і краязнаўчых матэрыялаў пра назву *Бронная Гара* таксама нязначная колькасць. В.А. Жучкевіч ўзгадвае гэту назву ў «Кароткім тапанімічным слоўніку Беларусі» (1974). Адна легенда апублікавана ў кнізе «Брэстчына: назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў» (1995). Некаторыя літаратурызаваныя сюжэты тапанімічных легенд публікуюцца ў рэгіянальнай і ведамаснай перыёдыцы [10], але яны ў асноўным цытуюць матэрыялы з пералічаных крыніц.

В.А. Жучкевіч сцвярджае: «Назвы-тэрміны ад слова *гара* абазначаюць ўзвышша, пагорак. Часта назва суправаджаецца вызначэннем Бронная Гара (*Валоў Гара, Воўчая Гара, Высокая Гара, Перабітая Гара, Палежач-Гара, Сухая Гара*). Азначэнні слова «гара» рознага паходжання: імя, характарыстыка аб'екта і г.д.» [4, с. 77].

Сістэматызаваўшы асобныя звесткі, мы вылучаем дзве асноўныя гіпотэзы паходжання тапоніма *Бронная гара*. Першая гіпотэза антрапанімічная: назва *Бронная Гара* ўтворана ад уласнага імя *Баніслаў*. У народнай тапаніміцы існуе легенда пра асілка *Браніславе*, які нападаў на купцоў і забіраў у іх скарбы, а грашыма дзяліўся з мясцовымі жыхарамі, сам жыў на гары. Аднойчы ён напаў на карэту, у якой знаходзілася прыгожая дзяўчына, ён узяў яе ў жонкі і пасля жыў мірна, ні на каго не нападаў. Калі памёр Браніслаў, яго пахавалі на гары, якую потым назвалі *Броннай* [2, с. 71].

Другая гіпотэза вайскова-гістарычная: назва вёскі ўтворана ад слова *браня* (*гара броні* альбо *бронная гара*). На карысць таго, што назва *Бронная Гара* паходзіць ад гістарызма *бронь /зброя,* сведчаць наступныя факты. Даследуемы населены пункт знаходзіцца ў невялікай адлегласці ад Бярозы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Картузкай (*цяпер* – раённы цэнтр Бяроза Брэсцкай вобласці). Падчас Паўночнай вайны 1700–1721 гг. шведскія войскі зруйнавалі само паселішча і мясцовы Картузіянскі кляштар, які знаходзіўся ў Бярозе-Картузкай і адыгрываў значную ролю як культурны цэнтр [3, с. 154]. Карл XII прайшоў са сваімі войскамі па Бярозе-Картузкай, аб гэтым сведчыць карта «Беларусь у гады Паўночнай вайны 1700-1721» у «Нацыянальным Атласе Беларусі» [7, 269 с.]. Верагодна, на мясцовасці засталося нямала фрагментаў баявых даспехаў пасля вайсковых дзеянняў. Карта рэльефа мясцовасці ўказвае, што на *Броннай Гары* існуе самая высокая кропка ў Бярозаўскім раёне [7, с. 66–67]. Такім чынам, тапонім *Бронная Гара* складаецца з дзвюх частак. Першая – *гара* – абазначэнне ланшафту, другая – *бронная* – абазначэнне гістарычных падзей (вайсковых дзеянняў).

З усяго гэтага магчыма зрабіць наступны вывад: у канцы XIV стагоддзя дадзены населены пункт меў назву горад *Броницарев,* у 1562 г. гэта быў маёнтак *Броннае,* а з 1700-х гг. – вёска *Бронная Гара*. Гісторыя гэтага населенага пункта застаецца невызначанай дасканала, што абумоўлена невялікай колькасцю гістарычных крыніц. Намі вылучана дзве гіпотэзы паходжання назвы. Але мы прытрымліваемся другой – вайскова-гістарычнай, якая найбольш абгрунтавана гістарычнымі звесткамі.

1. Акты издаваемые Виленскою Комиссіею для разбора древнихъ актовъ. Т.28. Акты о евреяхъ; под ред. Ю.О. Крачковского [и др.]. – Вильна : Русскій починъ, 1901. – 419 с.

2. Брэстчына. Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў / Склад. А.М. Ненадаўца. – Мінск : Беларусь, 1995. – 431 с. – (Мой родны кут).

3. Гарады і вёскі Беларусі. Т. 3. Брэсцкая вобласць : энцыкл.; пад рэд. Г.П. Пашкова [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – 528 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В.А. Жучкевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1974. – 448 с.

5. Исторические записки. Т.40. Список русских городов / М.Н. Тихомиров; под ред. Б.Д. Грекова [и др.]. – Москва : Академия наук СССР, 1937. – 361 с.

6. Кнатько, Г.Д. Белорусские остарбайтеры. Репатриация (1944 – 1951) : документы и материалы / Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко. – Минск : НАРБ, 1998. – 658 с.

7. Нацыянальны атлас Беларусі: карты. – Мінск : Белкартаграфія, 2002. – 292 с.

8. Рылюк, Г.И. Истоки географических названий Беларуси (с основами общей топонимики) / Г.И. Рылюк. – Минск : Веды, 1997. – 176 с.

9. Шамякин, И.П. Память. Историко-документальная хроника Берёзовского района / И.П. Шамякин. – Минск : БелСЭ, 1987. – 439 с.

10. Сокровищница военной мощи страны [Электронны рэсурс] // Белорусская военная газета. Во славу Родины. – Рэжым доступу : http: //vsr.mil.by/2013/05/07/sokrovishhnica-voennoj-m. – Дата доступу : 05.03.2014.

11. Stantsiya Bronnaya Gora [Электронны рэсурс] // Mapy archiwalne Polski i Europy Środkowej. — Рэжым доступу : http: //www.mapywig.org/m/Russian_and_Soviet_maps/seri. – Дата доступу : 26.02.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ